# 1945 ДА НАШЫХ ДЗЁН

## ПЯЦЬ МІРНЫХ ДЗЕСЯЦІГОДДЗЯЎ

### Поступ працоўных будняў

Пакуль ішла вайна, усе думкі, спадзяванні, намаганні мазыран былі звязаны з падзеямі на фронце. Імкнучыся наблізіць канчатковы разгром ворага, працоўныя вызваленых раёнаў Палесся ўнеслі ў фонд Чырвонай Арміі на будаўніцтва танкавай калоны 2 млн. 415 тыс. рублёў і прасілі перадаць танкі ў часці, якія носяць найменне «Мазырскіх» і «Калінкавіцкіх».

Аднаўленне Мазыра, якое пачалося адразу пасля яго вызвалення ад ворага, у 1945 г. набыло новы размах. Было адрамантавана 15 тыс. кв. м жылля, да канца года ўзнавілі работу 15 прадпрыемстваў і прамысловых арцеляў, якія выпусцілі прамысловай прадукцыі і тавараў народнага спажывання на 3 млн. 400 тыс. рублёў. У маі 1946 г. пушчана ў эксплуатацыю першая чарга Мазырскай ГЭС. Прадпрыемствы горада выпусцілі ў гэтым годзе прадукцыі на 5 млн. 916 тыс. рублёў, што амаль удвая больш, чым у 1945 г. Значна ўзрасла прадукцыйнасць працы.

У 1947 г. у Мазыры пачата будаўніцтва рамонтна-экскаватарнага завода, у верасні першую прадукцыю дала мэблевая фабрыка. 10 чэрвеня 1947 г. адкрыўся анкалагічны дыспансер і бальніца пры ім на 20 ложкаў. 5 красавіка пачалася пасадка дрэў у парку Перамогі.

Ужо ў 1948 г. народная гаспадарка горада была не толькі адноўлена, але і пераўзышла даваенны ўзровень. Працавалі швейная і мэблевая фабрыкі, аўтарамонтныя майстэрні, лесазавод «Чырвоны пралетарый», піўзавод, малочны завод, друкарня і іншыя прадпрыемствы. З пачатку 50-х гадоў мяняецца характар прамысловасці ў параўнанні з даваенным перыядам. Да вайны ў Мазыры развівалася ў асноўным дрэваапрацоўчая прамысловасць, на долю якой прыходзілася тры чвэрці ўсёй валавой прадукцыі. У пасляваенны час узніклі такія галіны, як машынабудаванне, кабельная вытворчасць, швейна-трыкатажная, вытворчасць будматэрыялаў і інш.

У 1958 г. у горадзе налічвалася 18 прамысловых прадпрыемстваў. Найбольш буйныя з іх — завод меліярацыйных машын, дрэваапрацоўчы камбінат, завод «Мазыркабель», ліцейна-механічны завод, завод жалезабетонных канструкцый, станцыя перапампоўвання нафты «Дружба» і іншыя. Шэраг арцеляў пасля аб'яднання ўтварылі камбінат бытавога абслугоўвання насельніцтва. Вытворчасць валавой прадукцыі прамысловых прадпрыемстваў горада склала больш як 13,5 млн. рублёў і пераўзышла ўзровень 1947 г. больш чым у 15 разоў. У снежні 1958 г. адкрыўся рух па жалезабетонным мосце цераз Прыпяць. У гарадской аўтагаспадарцы налічвалася 79 аўтобусаў, іх новыя маршруты звязалі розныя раёны горада. У Мазыры было 8 сярэдніх школ, адна сямігадовая, школа-інтэрнат, 4 ся-

рэднія школы рабочай моладзі, два дзіцячыя дамы. У школах працавалі 332 настаўнікі і займалася 4860 навучэнцаў.

За першыя пасляваенныя пяцігодкі значна развілася сетка лячэбных устаноў. У 1956 г. у Мазыры дзейнічалі: гарадская бальніца на 250 ложкаў, інфекцыйная бальніца на 75, радзільны дом на 40, супрацьтуберкулёзны дыспансер на 75, вендыспансер на 30 ложкаў, анкалагічны дыспансер, урачэбна-фізкультурны дыспансер, дом дзіцяці на 100 ложкаў, санітарна-эпідэміялагічная станцыя, станцыя «Хуткай дапамогі», два ўрачэбныя здраўпункты, 5 фельчарскіх здраўпунктаў. На ахову здароўя выдаткавана 11 744,7 тыс. рублёў — 50 працэнтаў гарадскога бюджэту. У горадзе працавала 116 урачоў.

У 60-я гады далейшае развіццё атрымала прамысловасць горада. Так, дрэваапрацоўчы камбінат наладзіў вытворчасць драўнянастружкавых пліт, сінтэтычных смол, новых узораў мэблі і інш. Яго прадукцыя карысталася попытам далёка за межамі рэспублікі. Тут выраблялася мэбля для Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта. У 21 краіну свету экспартавалася прадукцыя завода меліярацыйных машын. Завод атрымаў два дыпломы ВДНГ, а фрэзерны канавакапальнік КФН-1200 на міжнароднай выставе сельскагаспадарчай тэхнікі ўзнагароджаны вялікім залатым медалём. Заводу «Мазыркабель» у 1965 г. прысвоена ганаровае званне прадпрыемства высокай культуры вытворчасці Саўнаргаса БССР. Прадукцыя завода па якасці не ўступала лепшым сусветным узорам. Для пошуку радовішчаў нафты былі створаны экспедыцыі разведачнага свідравання, глыбіннага даследавання свідравін, дзве геолагаразведачныя экспедыцыі, у гэты ж час пачала дзейнічаць Прыпяцкая сплаўная кантора і іншыя арганізацыі. Капітальнае будаўніцтва ажыццяўляў трэст «Мазырсельбуд».

У 60-я гады ў горадзе было 11 сярэдніх школ, 3 васьмігадовыя і адна пачатковая, педагагічны інстытут, палітэхнікум, медыцынскае вучылішча, сямігадовая музычная і дзіцячая спартыўная школы, музычнае вучылішча. У школах працавалі 544 настаўнікі. У 15 лячэбных установах працавалі 700 спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. На кожную тысячу жыхароў прыходзілася 1383 экземпляры газет і часопісаў (у 1925 г. на 70 чалавек — адна газета). Дзейнічалі 3 кінатэатры, гарадскі Палац культуры, клубы на прадпрыемствах, народны тэатр, які на Усесаюзным аглядзе атрымаў званне лаўрэата.

Другую маладосць Мазыр атрымаў з пачаткам будаўніцтва нафтаперапрацоўчага завода. Побач з ім у паўднёва-ўсходняй прамысловай зоне была пабудавана цеплаэлектрацэнтраль. У 1983 г. даў першую прадукцыю завод кармавых дражджэй, які ў 1986 г. з увядзеннем у дзеянне 4-га пускавога комплекса выйшаў на поўную праектную магутнасць — 300 тыс. тон бялкова-вітамінных канцэнтратаў у год. З 1983 г. пачаў працаваць солевыварачны камбінат. Узведзены завод буйнапанельнага домабудавання магутнасцю 72 тыс. кв. м жылля ў год.

У горадзе пабудаваны буйнейшы ў Беларусі рачны вакзал. На высокім беразе Прыпяці ўзведзена гасцініца на 460 месцаў, на плошчы імя М. Горкага — сучасны крыты рынак, побач з ім — Дом быту. Пабудаваны Палац культуры нафтаперапрацоўчага завода, плавальны басейн, аэрапорт; трамвай звязаў горад з прамысловай зонай. У 1991 г. здадзены ў эксплуатацыю другі аўтамабільны мост цераз Прыпяць працягласцю каля 1000 м, які даў магчымасць накіраваць па абвадной дарозе транспарт і разгрузіць гарадскія магістралі.

Цяпер горад займае тэрыторыю каля 38 кв. км, ён працягнуўся ўздоўж Прыпяці амаль на 12 км. Планіровачную структуру горада вызначаюць асаблівасці берагавога рэльефу. Уздоўж набярэжнай праходзіць вуліца Савецкая, ад

якой па ўпадзінах між узгоркаў адгалінoўваюцца астатнія вуліцы: Ленінская, Калініна, Пушкіна, Саета, Куйбышава. На вуліцы Савецкай знаходзіцца цэнтральная гарадская плошча. У Мазыры 135 вуліц і завулкаў. Новыя жылыя раёны падступілі да самай чыгуначнай лініі Калінкавічы — Корасцень, аддаленай ад былых межаў горада на 5 км.

Насельніцтва Мазыра складае 107 тыс. чалавек. У 1986—1987 гг. прырост яго значна скараціўся, а ў 1990 г. скарачэнне колькасці насельніцтва перавысіла прырост на 354 чалавекі, што з'явілася вынікам аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Сённяшні Мазыр — даволі буйны індустрыяльны горад, яго прадпрыемствы выпрацоўваюць пятую частку ўсёй прамысловай прадукцыі Гомельскай вобласці. Многія прадпрыемствы сваёй прадукцыяй вядомы далёка за межамі рэгіёна.

З больш чым ста дваццаці прадпрыемстваў горада найбольш значнымі з'яўляюцца:

**Нафтаперапрацоўчы завод.** У 1963 г. урадам прынята рашэнне аб праектаванні і будаўніцтве МНПЗ. З 1971 г. разгортваецца ўзвядзенне многіх аб'ектаў будучага завода. 31 студзеня 1975 г. атрыманы першы палескі бензін. МНПЗ пастаўляе народнай гаспадарцы таксама карбюратарныя, дызельныя і кацельныя віды паліва, бытавыя газы і сыравіну для нафтахіміі, вадкія парафіны для вытворчасці бялкова-вітамінных канцэнтратаў, нафтавыя бітумы, серу і серную кіслату, бензол. У 1986 г. асвоена вытворчасць тавараў народнага спажывання: дзіцячых, школьных і жаночых боцікаў з полівінілхларыду. Штогод завод перапрацоўваў 16 млн. тон нафты. Колькасць працуючых дасягала 2 тысячы чалавек. Да 40 працэнтаў вырабляемай прадукцыі пастаўлялася за межы былога СССР. Сёння завод з'яўляецца акцыянерным таварыствам «Мазырскі НПЗ».

**Завод кармавых дражджэй.** Будаўніцтва пачалося ў 1978 г. пры долевым удзеле краін Савета Эканамічнай Узаемадапамогі. Першая прадукцыя была атрымана ў снежні 1983 г. 1 снежня 1986 г. завод выйшаў на праектную магутнасць 300 тыс. тон бялкова-вітамінных канцэнтратаў.

Па маштабах вытворчасці, навізне тэхналогіі, аснашчанасці сучасным абсталяваннем, узроўні аўтаматызацыі вытворчасці і кіравання завод не меў аналагаў сярод існуючых прадпрыемстваў мікрабіялагічнай прамысловасці. У 1995 г. завод перайшоў на выпуск этылавага рэктыфікаванага спірту і гарэлкі. Распачата вытворчасць ласьёнаў, зубных эліксіраў, духоў, мыйных сродкаў. На заводзе працуе 780 чалавек.

**Завод меліярацыйных машын.** Будаўніцтва пачалося ў 1945 г., спачатку гэта быў рамонтна-экскаватарны завод. Першы капітальна адрамантаваны экскаватар выйшаў у 1954 г. У 1955 г. асвоена вытворчасць чыгуннага ліцця, а пазней — стальнога. Выраблялі таксама пантоны, балотныя лыжы для канавакапальнікаў, цэнтрабежныя насосы і інш. З кастрычніка 1958 г. прадпрыемства стала называцца «Завод меліярацыйных машын». Карэнным чынам змяніўся асартымент прадукцыі: матавозы, нафтарухавікі, 40-тонныя тралеры, карчавальнікі, скрэперы і г. д. Канавакапальнік КФН-1200 удастоены вялікага залатога медаля на міжнароднай выставе ў Маскве. З 1960 г. прадукцыя стала пастаўляцца на экспарт: у Еўропу, Азію, Афрыку, Лацінскую Амерыку. Цяпер завод выпускае дрэнаўкладчыкі, бульдозеры, пагрузчыкі, маніпулятары для лясной гаспадаркі, тралы грузапад'ёмнасцю 50 тон, тратуарапрыбіральныя машыны для камунальнай гаспадаркі і інш. На заводзе працуе звыш 1600 чалавек.

**Вытворчае дрэваапрацоўчае аб'яднанне.** Будаўніцтва завода «Кіпратэх» пачалося ў 1915 г. для ваенных патрэб. Яго прадукцыя — піламатэрыялы. У 1931 г. пачаўся выраб піламатэрыялаў на экспарт у Германію, Францыю, Чэ-

хаславакію. У 1945 г. адноўлены і пушчаны дзве лесапільныя рамы. З 1948 г. завод пачынае развівацца як дрэваапрацоўчы камбінат. У 1955 г. пачаўся выпуск мэблі, драўнянастружкавых пліт, а ў 1971 г. на базе камбіната створана вытворчае дрэваапрацоўчае аб'яднанне «Мазырдрэў», у склад якога ўвайшлі Мазырская, Ельская і Калінкавіцкая мэблевыя фабрыкі. У аб'яднанні працуе звыш 3,5 тыс. работнікаў.

**Вытворчае мэблевае аб'яднанне.** У 1945 г. быў пабудаваны Мазырскі прамкамбінат, у яго склад з 1955 г. увайшла арцель «Чырвоны мэбельшчык». У 1971 г. прамкамбінат перайменаваны ў Мазырскі мэблевы камбінат, затым было створана вытворчае мэблевае аб'яднанне, у якое ўключана больш як пяць дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў і цэхаў, размешчаных у суседніх рэгіёнах. Аб'яднанне спецыялізуецца на выпуску мяккай і кухоннай мэблі. У аб'яднанні працуе каля 1000 чалавек.

**Завод «Беларуськабель».** Будаўніцтва завода пачалося ў 1958 г. У кастрычніку 1959 г. былі выпушчаны першыя сотні метраў проваду. У 1964 г. завод выйшаў на праектную магутнасць, асвоіў выпуск сілавых і кантрольных кабеляў, кабелю мясцовай сувязі, мантажныя правады, тавары народнага спажывання. На заводзе працуе звыш 2 тысяч чалавек.

**Завод «Мазырсельмаш».** Гісторыя завода пачынаецца ў лістападзе 1924 г. — з кавальскай майстэрні. У 1928 г. да яе далучылі бляшаную майстэрню і была створана арцель «Молат». 23 студзеня 1944 г., адразу пасля вызвалення Мазыра, прадпрыемства пачало даваць прадукцыю: калёсы, ложкі, формы для хлебапякарняў, сталы і г. д. Да 1947 г. арцель «Молат» была адноўлена поўнасцю. У 1948 г. асвоены выпуск веялак, цвікоў, прасаў, іншых тавараў народнага спажывання.

**Солевыварачны камбінат.** На базе багатых запасаў каменнай солі Мазырскага радовішча ў 1974 г. пачалося будаўніцтва солевыварачнага камбіната, праз год прабурана першая свідравіна. У 1982 г. атрыманы першы кандыцыйны расол і першая соль.

У лютым 1987 г. камбінат выведзены на праектную магутнасць — 360 тыс. тон солі «Экстра» ў год. Працуе на камбінаце каля 700 чалавек.

Акрамя вышэйпералічаных прадпрыемстваў у горадзе працуюць:

**Цеплаэлектрацэнтраль (ЦЭЦ).** Уведзена 1 студзеня 1974 г. магутнасцю 195 Мвт.

**Піваварны завод.** Існуе з 1885 г. Асноўная прадукцыя: піва і безалкагольныя напіткі.

**Аўтарамонтны завод** магутнасцю звыш 5600 капітальных рамонтаў у год. Працуе звыш 300 чалавек.

**Трыкатажная фірма «Славянка».** Пачатак паклала ў 1927 г. арцель з 19 чалавек па вырабе панчох. Зараз фабрыка — стабільнае прадпрыемства, якое працуе на сучасным абсталяванні і па сучаснай тэхналогіі. Асноўная прадукцыя: верхні трыкатаж і пальчатачныя вырабы. Працуе каля 900 чалавек.

**Швейная прамыслова-гандлёвая фірма «Надэкс».** Заснавана 20 красавіка 1944 г., спецыялізуецца на пашыве мужчынскіх сарочак, дзіцячых і жаночых блуз з усіх відаў тканін з штогадовым выпускам да 1 млн. штук, занята каля 1000 чалавек.

**Фабрыка мастацкіх вырабаў.** Працуе з мая 1956 г. Асноўная прадукцыя: ткацтва, лазапляценне, мастацкая кераміка, мастацкае вязанне і вышыўка. Працуе 240 чалавек.

**Фабрыка індпашыву і рамонту абутку.**

**Малочны завод.** Працуе з 1965 г. Магутнасць — да 190 тон перапрацоўкі малака ў суткі. Гэта другое прадпрыемства ў рэспубліцы, дзе дзейнічае цэх дзіцячага харчавання. Працуе 280 чалавек.

**Мазырская ўзбуйненая друкарня.** Заснавана ў 1900 г. Цяпер у ёй дру-

куецца 8 газет для Палескага рэгіёна, а таксама этыкетачная прадукцыя, кнігі, розныя бланкі. Працуе 130 чалавек.

**Фірма рознабытавых паслуг «Сузор'е».**

**Два хлебазаводы.**

У Мазыры працуюць дзве буйныя будаўнічыя арганізацыі:

**Аб'яднанне «Мазырсельбуд».** Гісторыя аб'яднання пачынаецца з 1939 г. Зараз у яго склад уваходзіць 14 міжгаспадарчых перасоўных механізаваных калон, 5 спецыялізаваных перасоўных механізаваных калон, упраўленне механізацыі, аўтабаза, 4 дарожна-будаўнічыя перасоўныя механізаваныя калоны, завод жалезабетонных вырабаў, завод буддэталяў, жыллёва-камунальная кантора. У Мазыры размешчаны 11 з пералічаных арганізацый. Аб'яднанне выконвае будаўнічыя работы на тэрыторыі 11 раёнаў Гомельскай вобласці, у ім працуе звыш 5 тыс. чалавек.

**Дзяржаўна-кааператыўная фірма «Трэст № 6».** Створаны ў 1970 г. для будаўніцтва аб'ектаў нафтаперапрацоўчага завода. За 25 гадоў трэстам пабудаваны акрамя НПЗ заводы зборнага жалезабетону № 12, мантажных загатовак, керамзітавага гравію ў Петрыкаве, солевыварачны камбінат і многія іншыя аб'екты прамысловасці і сацкультбыту.

Зараз у склад трэста ўваходзяць 7 будаўнічых упраўленняў, шэраг кааператываў.

У Мазыры **два аўтобусныя паркі і два прадпрыемствы грузавых аўтамашын, трамвайнае дэпо.** Працуюць **экспедыцыі:** нафтаразведачная глыбокага бурэння, геафізічнага даследавання свідравін, комплексная геафізічная партыя і іншыя прадпрыемствы.

У горадзе шырока развіта сістэма гандлёвых прадпрыемстваў. Статус юрыдычнай асобы дадзены 40 магазінам і 14 прадпрыемствам грамадскага харчавання, якія не ўвайшлі ў гаспадарчыя структуры. Пад фірменны гандаль перададзена 19 магазінаў, у тым ліку 5 прадпрыемстваў дзяржаўнай формы ўласнасці: аб'яднанне школьнага харчавання, два аб'яднанні студэнцкага харчавання, аб'яднанне грамадскага харчавання, рэстаран «Юнацтва». Дзейнічаюць гандлёвыя, у тым ліку і фірменныя прадпрыемствы некаторых іншых міністэрстваў і ведамстваў. Гандлёвая ж сетка камерцыйных структур прадстаўлена 45 магазінамі.

У апошнія гады ствараюцца і ўносяць свой уклад у развіццё горада прадпрыемствы недзяржаўных формаў уласнасці. Зарэгістравана больш як 340 таварыстваў з абмежаванай адказнасцю, 57 малых прадпрыемстваў, сярод іх 97 прыватных, больш як 40 кааператываў, 22 акцыянерныя таварыствы і каля дзвюх тысяч прадпрымальнікаў, што ажыццяўляюць сваю дзейнасць як фізічныя асобы.

Мазыр сёння — развіты цэнтр падрыхтоўкі кадраў для Палесся. Тут працуюць педагагічны інстытут, палітэхнікум, медыцынскае і музычнае вучылішчы, чатыры прафесійна-тэхнічныя вучылішчы, 15 сярэдніх школ. Вось некаторыя навучальныя ўстановы:

**Мазырскі дзяржаўны педагагічны інстытут.** 23 лютага 1944 г. Савет Народных Камісараў БССР прыняў пастанову аб адкрыцці Мазырскага дзяржаўнага настаўніцкага інстытута. У сакавіку таго ж года інстытут прыняў 210 студэнтаў на тры аддзяленні: фізіка-матэматычнае, гісторыка-філалагічнае і прыродазнаўча-геаграфічнае. У 1946 г. адбыўся першы выпуск: 86 настаўнікаў гісторыі, мовы і літаратуры, 32 — фізікі і матэматыкі, 36 — прыродазнаўства і геаграфіі. Праз год 36 чалавек закончылі інстытут без адрыву ад вытворчасці.

У 1952 г. настаўніцкі інстытут быў рэарганізаваны ў Дзяржаўны педагагічны інстытут, які пачаў рыхтаваць настаўнікаў з вышэйшай адукацыяй. Адначасова была зменена і структура інстытута. На два факультэты было прынята: філалагічны — 100, фізіка-матэматычны — 75 першакурснікаў. У той час на 7 кафедрах працавала 25 выкладчыкаў, у тым ліку 2 кандыдаты навук.

За 50 гадоў існавання інстытут стаў буйной ВНУ. На 6 факультэтах (дзённым і завочным аддзяленнях) навучаецца каля 5 тыс. студэнтаў па 20 спецыяльнасцях. На 23 кафедрах працуюць 294 выкладчыкі, у тым ліку 97 кандыдатаў, 2 дактары навук, 3 прафесары. Ёсць аспірантура, навукова-даследчы сектар, падрыхтоўчае аддзяленне. За час існавання інстытута падрыхтавана амаль 19 тысяч настаўнікаў.

**Мазырскі політэхнічны тэхнікум.** Заснаваны 19 лістапада 1963 г., першапачаткова як вячэрні. Спецыяльнасць — апрацоўка металаў рэзаннем. У 1964 г. адкрыты спецыяльнасці «прамысловае і грамадзянскае будаўніцтва» і «электраабсталяванне прамысловых прадпрыемстваў і ўстановак». У 1965 г. адкрыта дзённае аддзяленне са спецыяльнасцю «прамысловае і грамадзянскае будаўніцтва», у 1979 г. — «вытворчасць будаўнічых дэталяў і жалезабетонных канструкцый», у 1983 г. — «тэхнічнае абслугоўванне і рамонт аўтамабіляў», у 1988 г. — «тэхнічнае абслугоўванне станкоў з праграмным кіраваннем і робата-тэхнічных комплексаў», «інструментальная вытворчасць». Зараз тэхнікум рыхтуе спецыялістаў на дзённым аддзяленні па 4 спецыяльнасцях. За ўвесь час падрыхтавана звыш 5 тысяч спецыялістаў.

**ПТВ-131 будаўнікоў.** Вучылішча заснавана ў 1976 г. На 1-шы курс у 1977 г. было залічана 275 навучэнцаў па спецыяльнасцях будаўнічага профілю для падрыхтоўкі да работы ў базавым трэсце «Мазырнафтахімбуд».

Вучылішча падрыхтавала 2700 кваліфікаваных рабочых. Зараз у ім працуе 45 майстроў вытворчага навучання і 18 выкладчыкаў.

**Медыцынскае вучылішча.** Двухгадовая школа медыцынскіх сясцёр, якая да вайны зрабіла тры выпускі, пасля вайны была перайменавана ў фельчарска-акушэрскую, а ў 1954 г. — у медыцынскае вучылішча, якое мела тры аддзяленні: фельчарскае, акушэрскае і сястрынскае. У 1981 г. уступіў у дзеянне новы будынак вучылішча, а ў 1990 г. — інтэрнат на 350 месцаў. Навучэнцаў — звыш 1300 чалавек, педагогаў — 56. За гады існавання падрыхтавана каля 8,5 тысяч спецыялістаў.

Ахову здароўя жыхароў Мазыра ажыццяўляюць 14 лячэбных устаноў, аб'яднаных у тэрытарыяльнае медыцынскае аб'яднанне: бальніца на 1495 ложкаў, развітая сетка паліклінік і амбулаторый. У горадзе 2754 медыцынскіх работнікаў, у тым ліку 386 урачоў, 1652 медыцынскія сястры.

Дзякуючы дапамозе шэрага гарадскіх прадпрыемстваў бальніцы і паліклінікі маюць самае сучаснае абсталяванне, вядзецца будаўніцтва новых лячэбных устаноў.

У горадзе дзейнічаюць 12 палацаў, дамоў культуры і клубаў, выставачная зала, мастацкая школа, 4 музычныя школы, краязнаўчы музей, 53 бібліятэкі.

*Л. Арлоў, Т. Піліпчук*

Не толькі горад Мазыр непазнавальным стаў за пяць мірных дзесяцігоддзяў, выдатныя перамены адбыліся і ва ўсім Мазырскім раёне. А пачынаў падымацца ён на пасляваенных папялішчах, у далёкім 1944-м. Адбудоўваліся разбураныя вайной вёскі, герaічнай працай аднаўлялася гаспадарка калгасаў. У гэтай справе вяскоўцам актыўна дапамагалі жыхары горада.

Яшчэ ў 1944 г. у асобных калгасах ураджайнасць збожжавых склала 80—90, а ў некаторых — 100 пудоў з гектара, ураджайнасць бульбы каля 1000 пудоў з гектара. А хлебаробы калгаса імя Кірава ўзялі абавязацельствы дабіцца ў 1946 г. 100-пудовага ўраджаю збожжавых і 1500 пудоў бульбы з гектара. Маладыя калгаснікі Уладзімір Глюз з калгаса «Чырвоная Зорка» і Рыгор Панфіленка з калгаса «Партызан» за дзень узворвалі 0,65 гектара пры норме 0,50. Адам Паўлюк з вёскі Малыя Зімовішчы выпрацаваў за год 400 працадзён. Скончыўшы потым Беларускую

Першае пасляваеннае збожжа — дзяржаве. Калгаснікі в. Жахавічы даставяць яго па Прыпяці на збожжапрыёмны пункт. 1946




сельгасакадэмію, Адам Фёдаравіч звыш 20 гадоў узначальваў калгас імя Фрунзе.

На працягу 1945—1947 гг. да мірнай стваральнай працы прыступіла больш як 5 тысяч былых франтавікоў, якія гарэлі жаданнем хутчэй аднавіць народную гаспадарку, палепшыць жыццё людзей. Сярод тых, хто вярнуўся з вайны, былі: І. М. Букіш з вёскі Раеўскія — 40 гадоў адпрацаваў на трактары; М. А. Кунгер і Р. А. Рудзько — доўгі час былі кіраўнікамі калгасаў; П. Д. Анціпенка, які залажыў славу гурыноўскіх садоў; А. Н. Пікуза і П. Д. Вягера, якія 40 гадоў працавалі ва ўстановах народнай адукацыі; І. Т. Аўдзейчык і П. П. Крывянчук — кіраўнікі органаў мясцовай улады раёна; кавалер двух ордэнаў Славы І. Ф. Пісанік і баявы кавалерыст К. Р. Ткач — жывёлаводы з вёсак Касцюковічы і Жахавічы, і многія, многія іншыя,— усе, хто сваёй шчырай працай залечваў раны вайны, будаваў новае жыццё.

Да 1950 г. у раёне быў адноўлены даваенны ўзровень вытворчасці ў калгасах. Чацвёртую пяцігодку раён выканаў паспяхова. Ураджайнасць збожжавых склала 12 цэнтнераў з гектара, пэўныя поспехі былі дасягнуты і ў развіцці жывёлагадоўлі. У калгасах раёна стала болей сельскагаспадарчай тэхнікі, павялічылася пагалоўе жывёлы. У новую, пятую пяцігодку сельская гаспадарка раёна ўступіла значна ўмацаванай. Уплыў на яе развіццё аказалі рашэнні вераснёўскага (1953 г.) Пленума ЦК КПСС. З калгасаў была знята запазычанасць, калгаснікі вызвалены ад цяжкіх падаткаў. Ураджайнасць збожжавых за пятую пяцігодку была даведзена да 13,9 цэнтнера з гектара, бульбы — да 91 цэнтнера, а надоі малака ад каровы склалі амаль 1200 кілаграмаў за год.

Шмат намаганняў прыклала кіраўніцтва раёна ў падборы і выхаванні кіраўнікоў калгасаў і саўгасаў. Жыхары памятаюць старшынь калгасаў, якія працавалі на гэтай пасадзе не адзін дзесятак гадоў,— М. А. Кунгера, М. Н. Кузьменку, І. Н. Купермана, М. С. Радкевіча, К. С. Гарулю, а таксама А. Ф. Паўлюка, П. І. Сітніка. З 1968 па 1996 г. узначальваў калгас «Прамень Кастрычніка» В. А. Сазонаў. Шмат зрабіў, каб вывесці калгас «Радзіма» з адстаючых, і старшыня М. У. Саўчык.

Жыхары вёсак за першыя пяць пасляваенных гадоў перасяліліся з зям-



М. А. Кунгер



Р. А. Рудзько



І. Ф. Пісанік

лянак у новыя хаты. Былі пабудаваны ўсе вытворчыя памяшканні калгасаў, школы, клубы, магазіны. У раёне працавалі Слабадская і Мазырская машынна-трактарныя станцыі. Пачалося ўз'яднанне дробных калектыўных сельскіх гаспадарак. Да 1956 г. з 80 калгасаў было ўтворана 26, а ў 1970 г. іх было ўсяго 20. Гэта давала магчымасць больш эфектыўна выкарыстоўваць зямлю, тэхніку, кваліфікаваныя кадры. У першай палове 60-х гадоў на базе эканамічна слабых гаспадарак былі створаны саўгасы — «Мазырскі» з цэнтрам у вёсцы Міхалкі і «Каменка».

Адбыліся змены тэрыторыі раёна. У студзені 1963 г. у склад Мазырскага раёна ўключаны 13 вёсак Асавецкага сельскага Савета Петрыкаўскага раёна, 6 вёсак Махнавіцкага сельсавета Ельскага раёна, а таксама Барбароўскі сельскі Савет Нараўлянскага раёна (9 вёсак і пасёлкаў). Сталі буйнейшымі іншыя сельсаветы за кошт ліквідацыі Бабраняцкага, Глініцкага, Казіміраўскага і Мялешкавіцкага.

Ішлі гады, умацоўвалася эканоміка калгасаў і саўгасаў. Перад вайной у калгасах раёна мелася 6670 галоў буйной рагатай жывёлы, 3500 авечак, 3000 свіней, а ў 1968 г. — 18 тысяч галоў буйной рагатай жывёлы, 10 тысяч свіней, 3600 авечак. Умацавалася тэхнічная база калгасаў і саўгасаў. Пасля ліквідацыі машынна-трактарных станцый і перадачы тэхнікі калгасам і саўгасам у гаспадарках налічвалася 250 трактароў, 78 камбайнаў, 170 грузавых аўтамабіляў і іншая тэхніка.

Паглыблялася спецыялізацыя сельскагаспадарчай вытворчасці. У 1973 г. на базе былога саўгаса «Рудня», створанага раней у адным з аддзяленняў саўгаса «Мазырскі», была арганізавана Мазырская птушкафабрыка, цэнтральная сядзіба якой размяшчалася ў вёсцы Ляхаўцы. У 1975 г. на асушаных і асвоеных землях у ваколіцах Мазыра створана міжгаспадарчае прадпрыемства па вытворчасці корму «Прыпяць» (цяпер саўгас). У студзені 1989 г. на аснове саўгаса «Каменка» арганізавана Мазырская агароднінная фабрыка. На частцы каменкаўскіх земляў быў створаны саўгас «Чырвоны Сцяг» (цэнтр вёска Мялешкавічы).

У сувязі з вялікім прамысловым будаўніцтвам на тэрыторыі раёна, перасяленнем жыхароў вёсак Кустаўніца і Міхалкі былі пабудаваны добраўпарадкаваныя пасёлкі Крынічны і Рудня Міхалкаўская (цэнтр саўгаса «Мазырскі»). У 1976 г. у пасёлак Крынічны была перабазіравана з суседняга Калінкавіцкага раёна Палеская сельскагаспадарчая доследная станцыя. Сам пасёлак у гэтым жа годзе стаў цэнтрам новай гаспадаркі — эксперыментальнай базы «Крынічная», якой быў падпарадкаваны новы буйны комплекс па вырошчванні і адкорму 54 тысяч галоў свіней у год. У 1996 г. комплекс стаў самастойнай гаспадаркай — саўгасам-камбінатам

«Зара». Такой жа спецыялізаванай гаспадаркай (20 тысяч свіней у год) стаў калгас «Прамень Кастрычніка». Буйныя жывёлагадоўчыя комплексы ў 70—80-я гады былі пабудаваны ў вёсках Перадрэйка, Слабада, Рудня Міхалкаўская, Козенкі. Практычна нанава былі адбудаваны і рэканструяваны ўсе вытворчыя памяшканні калгасаў і саўгасаў — фермы, машынныя двары, гаражы, майстэрні, склады, сховішчы і інш.

Значная работа была праведзена па асушэнні і асваенні забалочаных і пераўвільготненых, зарослых хмызняком земляў, створана раённая меліярацыйная арганізацыя — ПМК-27 трэста «Калінкавічыводбуд». Пабудаваны польдэрныя (з водарэгуляваннем) участкі. Усяго больш як 11 700 гектараў былых балот, дзе расла асака ды іншыя балотныя травы, ператвораны ў высокаўраджайныя палеткі. На 8800 гектарах закладзены закрыты дрэнаж, пабудаваны насосныя станцыі. Для захавання вільгаці створаны дзесяткі штучных вадаёмаў (каля вёсак Тварычаўка, Каменка, Махнавічы, Мялешкавічы, Майсееўка, Лешня і іншых).

Вялікая работа праведзена ў раёне па зберажэнні прыроднага асяроддзя. Лясны фонд Мазыршчыны складае 80,9 тыс. гектараў — больш як палова тэрыторыі раёна. У 1962 г. створаны Мазырскі лясгас, у склад якога ўваходзяць 10 лясніцтваў. Штогод на плошчы 300—500 гектараў праводзяцца пасадкі лесу. За 30 год праведзены лесааднаўляльныя работы на плошчы 15 тыс. гектараў, пятая частка лесу — штучныя насаджэнні. У вытворчасць укараняюцца новыя тэхналогіі лесанарыхтоўчых і аднаўляльных работ, ствараюцца зоны адпачынку і заказнікі.

На Мазыршчыне здабываецца будаўнічы пясок і гравій. Непадалёку ад вёскі Раеўскія знойдзена каменная соль, прамысловыя залежы якой больш за 600 млн. тон, перспектыўныя — 24 млрд. тон. Больш за 10 гадоў назад тут адкрыты буйнейшы ў Еўропе солевыварачны камбінат. Разведаны таксама прамысловыя запасы гліны (Лешня, Рудня Скрыгалаўская). У раёне вёсак Васькаўка і Скрыгалаў з прабураных свідравін атрыманы прамысловы прыток нафты.

З 1967 г. на Мазыршчыне працуе Палеская геафізічная экспедыцыя, пабудаваны пасёлак геолагаў Сасновы, створана неабходная матэрыяльна-тэхнічная база.

У раёне на працягу многіх гадоў шырока вялося будаўніцтва жылля, вытворчых, адміністрацыйных і сацыяльна-культурных аб'ектаў. Для ажыццяўлення будаўнічай праграмы ў 1965 г. была створана Мазырская міжкалгасная будаўнічая арганізацыя, старшынёй якой больш як 10 год працаваў Д. Ц. Гузман, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, першым сярод працаўнікоў раёна ўзнагароджаны ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі. За поспехі ў аднаўленні вёсак у 1971 г. Мазырская МБА ўзнагароджана ордэнам «Знак Пашаны». Дзесяткі будаўнікоў атрымалі ордэны і медалі, а брыгадзір В. К. Чурыла стаў лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі.

Пасля катастрофы на Чарнобыльскай АЭС у раён з пацярпеўшай зоны было перасялена каля 300 сем'яў, для якіх пабудавана 8 пасёлкаў.

У развіцці раёна вялікае значэнне надаецца дарогам, працягласць якіх складае звыш 350 км. Для іх будаўніцтва і рамонту ў 1965 г. створана ДЭУ-186. Да 1962 г. праз раён праходзіла адзіная дарога з цвёрдым пакрыццём — Мазыр — Оўруч. За апошнія 30 год рэканструявана і пабудавана 307 км дарог з цвёрдым пакрыццём, імі звязаны ўсе цэнтры калгасаў і саўгасаў, населеныя пункты.

У раёне адкрыта больш за 30 аддзяленняў сувязі, усе 93 вёскі і пасёлкі тэлефанізаваны. У дамах вяскоўцаў устаноўлена больш як 3500 тэлефонаў і каля 9 тысяч радыёкропак. Пабудаваны ўчастковыя бальніцы ў вёсках Асавец, Мялешкавічы, Слабада, Скрыгалаў, амбулаторыя ў вёсцы Рудня Міхалкаў-



Урач Н. М. Падаляцкая. Актыўная ўдзельніца Вялікай Айчыннай вайны, 30 гадоў працавала ў раённай паліклініцы

ская. Цяпер у раёне 4 участковыя бальніцы на 160 ложкаў, у тым ліку ў Слабадзе — на 75. Адкрыты 31 фельчарска-акушэрскі пункт, 1 амбулаторыя, 5 аптэк, раённая паліклініка.

У раёне 101 магазін, працуюць 4 аўталаўкі, 40 сталовых, кафэ і рэстаранаў. У вёсках Козенкі, Рудня Міхалкаўская, Слабада, пасёлку Крынічным пабудаваны гандлёвыя цэнтры.

У першыя пасляваенныя гады пачатковыя школы дзейнічалі ва ўсіх населеных пунктах. У вёсках, дзе налічвалася 100 і больш двароў, працавалі васьмігодкі і сярэднія школы. У 1960 г. у раёне было звыш 17 тысяч вучняў За апошнія 20 гадоў закрыта 46 васьмігодак і пачатковых школ. У 1995 г. у раёне налічвалася 11 сярэдніх, 9 базавых і 6 пачатковых школ, у якіх працавала 487 настаўнікаў, навучалася 3477 школьнікаў.

Пабудаваны тыповыя сельскія клубы ў вёсках Асавец, Бабраняты, Барбароў, Глініца, Вялікія Зімовішчы, Козенкі, Махнавічы, Лучажэвічы, Прудок, Рудня Міхалкаўская, Скрыгалаў, Слабада, у пасёлках Крынічны і Сасновы. У населеных пунктах раёна налічваецца 36 клубаў, 33 бібліятэкі з агульным кніжным фондам 363 тысячы кніг. Ва ўстановах культуры працуе 138 чалавек. Створана 18 калектываў мастацкай самадзейнасці. Сельскія клубы маюць 22 стацыянарныя шырокаэкранныя кінаўстаноўкі.

З 1976 г. у вёсцы Гурыны працуе раённая карцінная галерэя — філіял Беларускага дзяржаўнага мастацкага



Пераможцы раённага спаборніцтва школьных вытворчых брыгад на злёце ў Мазыры. 1977

музея. На грамадскіх асновах створаны музей партызанскай славы ў вёсцы Раманаўка, музей гісторыі вёскі ў Махнавічах, этнаграфічны музей у Міхалкаўскай Рудні, музей у Скрыгалаве.

Шчодрая Мазыршчына на выдатных людзей, яна дала шмат герояў вайны і мірнай працы. За ратныя подзвігі ў гады ваеннага ліхалеццям звыш пяці тысяч яе жыхароў былі ўзнагароджаны баявымі ордэнамі і медалямі, больш як тысяча непасрэдных вытворцаў матэрыяльных даброт — рабочых, калгаснікаў, спецыялістаў узнагароджаны ў мірны час. А колькі вядомых людзей даў гэты невялікі куток беларускай зямлі! З вёскі Барбароў выйшаў акадэмік М. Я. Мацапура, з Кустаўніцы — акадэмік П. Ф. Ракіцкі, з Перадрэйкі — генерал-палкоўнік М. І. Шляга. У Лешні нарадзіліся Герой Савецкага Саюза М. П. Катлавец, генералы С. І. Ганчар і В. С. Пузан, начальнік Днепрагэса М. А. Дубавец. З вёскі Забалацце выйшаў пісьменнік І. І. Капыловіч, з Майсееўкі — журналіст, былы рэдактар «Сельскай газеты» А. Д. Колас. У Іванкаўшчыне ў хаце калгасніка Адама Гусака выраслі тры яго сыны Аляксей, Сяргей і Мікалай — тры беларускія вучоныя.

Настаўнікі былой Міхалкаўскай школы з дапамогай мясцовага насельніцтва прааналізавалі шлях сваіх выпускнікоў за 60 гадоў. Гэта каля 600 спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, 35 з іх — работнікі сельскай гаспадаркі, 60 — настаўнікі, 52 — афіцэры Савецкай Арміі і адзін генерал. Ёсць пісьменнік, кампазітар, тры журналісты, 17 інжынераў, 50 медработнікаў і інш.

*С. Касцян, М. Капач*

## ПА СТАРОНКАХ МЯСЦОВЫХ ГАЗЕТ

### ГАРАДСКАЯ ГАЗЕТА «ЗАРА»

**Студэнцкая вуліца**

Вуліца Рамашоў Роў з кожным годам мяняе сваё аблічча. Тут выраслі новыя жылыя дамы. Днямі будаўнікі здалі ў эксплуатацыю прасторны светлы чатырохпавярховы будынак. У ім размясціўся Мазырскі педагагічны інстытут.

*20 сакавіка 1955 г.*

**Новая аўтобусная станцыя**

На вуліцы Жытомірскай, каля калгаснага рынка, пабудавана новая аўтобусная станцыя. Тут ёсць вялікая зала, камера захоўвання ручнога багажу і дыспетчарскі пункт. Устаноўлены дынамік, па якім аб'яўляецца аб адпраўленні аўтобусаў у многія вёскі Мазыршчыны, суседнія раёны...

*26 студзеня 1958 г.*

**Расце і прыгажэе Мазыр**

За чатыры гады (1954—1957) разросся, раздаўся ўшыр, папрыгажэў Мазыр. Больш за ўсё мазыране ганарацца дрэваапрацоўчым камбінатам...

Рост выпуску прадукцыі прадпрыемствамі Мазыра ў параўнанні з 1954 г. — 125 %, рост перавозак грузаў аўтатранспартам — 163 %, рост перавозак пасажыраў аўтатранспартам — 134 %, рост жыллёвага будаўніцтва — 161 %...

Першы навучальны год працуе ў горадзе школа-інтэрнат. На абсталяванне і ўтрыманне школы дзяржава выдаткавала да 4,5 мільёнаў руб. ...

Выдатны добраўпарадкаваны клуб здадзены ў эксплуатацыю ў лістападзе мінулага года ў пасёлку станцыі Мазыр...

Закончана будаўніцтва фае кінатэатра «Радзіма». У хуткім часе тут будзе абсталявана чытальня, буфет. Мазыран сёлета абслугоўваюць 6 стацыянарных установак і 2 кінаперасоўкі.

У 1956—1957 гг. расшырана тэрыторыя парку. Сёлета тут будзе ўстаноўлена карусель, абсталяваны спартыўныя і дзіцячыя пляцоўкі, тэнісны корт...

*16 лютага 1958 г.*

### ГАЗЕТА «КАМУНІСТ ПАЛЕССЯ»

**Новы малочны камбінат**

Будаўніцтва Мазырскага малочнага камбіната ўступіла ў завяршаючы перыяд. Ужо ўзведзены галоўны корпус, падсобныя пабудовы. Зараз вя-

дзецца абсталяванне кампрэсарнай, кацельнай, трансфарматарнай падстанцыі. Неўзабаве пачнецца мантаж абсталявання...

*17 студзеня 1963 г.*

**Будаваць хутка, якасна, прыгожа**

Прыгажэе наш родны Мазыр. За апошнія гады ў горадзе выраслі шматпавярховыя дамы, пракладзены новыя вуліцы, пабудаваны новыя прадпрыемствы...

Расшыраецца сетка медыцынскіх устаноў. У новым мікрараёне непадалёку ад цэнтра горада ўзводзіцца радзільны дом на 100 месц. Задача будаўнікоў — умела выкарыстаць рэзервы, будаваць хутка, трывала, танна...

*14 сакавіка 1963 г.*

**Ю. Левітан — госць Мазыра**

Нядаўна Мазыр наведаў маскоўскі дыктар Ю. Левітан. У гарадскім парку ён сустрэўся з мазыранамі, дзе расказаў аб рабоце дыктараў сталіцы.

*1 чэрвеня 1963 г.*

**Для народнай гаспадаркі**

Калектыў эксперыментальнага ўчастка завода меліярацыйных машын выпусціў доследны ўзор новага канавакапальніка КФН-1200. Агрэгат прызначаны для пракладкі каналаў у забалочаных месцах. Нядаўнія выпрабаванні паказалі выдатныя эксплуатацыйныя якасці машыны.

Цяпер машынабудаўнікі прыступілі да серыйнага выпуску канавакапальніка. У верасні будзе выпушчана 10 канавакапальнікаў.

*27 жніўня 1963 г.*

**Волжская нафта на беларускай зямлі**

Волжская нафта рухаецца па стальных магістралях, пракладзеных на беларускай зямлі. Каб паскорыць рух чорнага золата, будаўнікі самай буйной помпавай станцыі, што на тэрыторыі Мазырскага раёна, з кожным днём узмацняюць тэмпы работ...

*7 лістапада 1963 г.*

**Прадукцыі будзе больш**

15 назваў вырабаў выпускае цяпер завод «Мазыркабель». Некаторыя з іх на ўзроўні лепшых сусветных узораў. Павелічэнню выпуску кабельнай прадукцыі садзейнічае ўкараненне новай тэхнікі. Значна абнаўляецца станочны парк валачыльнага цэха. За апошні час у ім устаноўлена і запушчана 16 круцільных машын для выпуску гібкіх мантажных правадоў.

Днямі мантажнікі прыступілі да ўстаноўкі чатырох новых магутных круцільных машын, якія па прадукцыйнасці пераўзыходзяць дзеючыя круцільныя машыны больш чым у два разы.

У гэтай пяцігодцы завод значна павялічыць выпуск мантажных правадоў. Для гэтага пачалося будаўніцтва спецыяльнага вытворчага корпуса.

*25 чэрвеня 1964 г.*

**Папоўніўся аўтобусны парк**

У 1965 г. транспартам горада перавезена 11 мільёнаў пасажыраў. Аўтобусны парк папоўніўся 35 новымі аўтобусамі і 8 легкавымі таксі. На пасёлак станцыі Мазыр будуць курсіраваць мнагамесныя аўтобусы «ЛАЗ-695»... Адкрываюцца новыя аўтобусныя лініі па маршруце плошча Леніна — прамкамбінат. Ставіцца задача звязаць аўтамабільным рухам усе сельсаветы і цэнтры калгасаў раёна.

*19 лютага 1966 г.*

**Прафілакторый для будаўнікоў**

На базе піянерскага лагера «Сядзельнікі» трэста «Мазырсельбуд» ствараецца лячэбны прафілакторый на 50 чалавек...

*17 верасня 1966 г.*

**Новая школа**

Яшчэ здалёку прыцягвае позірк прыгожы белакаменны трохпавярховы будынак мазырскай сярэдняй школы № 5, які ўзведзены ў пасёлку завода жалезабетонных вырабаў. Бацькі і дзеці выказвалі сардэчную падзяку будаўнікам за падарунак. Цяпер заняткі вядуцца ў адну змену. Ёсць умовы для спартыўнай работы, правядзення пазакласных мерапрыемстваў.

*25 лютага 1968 г.*

**Злёт былых партызан**

У Казіміраўскім лесе, на адной з патаемных палян, адноўлены дзве зямлянкі, курэнь, калодзеж, сталы. Тут у 1943 г. размяшчаліся партызаны Мазырскай партызанскай брыгады імя Аляксандра Неўскага. А цяпер яны правялі ў гэтым месцы свой злёт. У запаведным лесе адкрыты помнік героям-партызанам.

*21 жніўня 1968 г.*

**Рапартуюць паліграфісты**

Школьны дзённік. Сёй-той можа сказаць: дробязь. Але гэта далёка не так. Ён крайне неабходны настаўнікам, вучням, бацькам. Не так даў

но дзённікі завозілі ў Мазыр з іншых гарадоў рэспублікі, прытым не заўсёды ў дастатковай колькасці. Зараз такімі дзённікамі наша друкарня забяспечвае ўсіх школьнікаў рэспублікі. З пачатку гэтага года іх ужо выпушчана 800 тысяч.

Паспяхова выконвае калектыў нашай друкарні і іншыя заказы Міністэрства асветы Беларусі. Ужо выпушчана, напрыклад, 110 тысяч класных журналаў. Адгружана таксама 5 тысяч кніг дашкольнай дакументацыі. А колькасць маляўніча аформленых цэлафанавых пакетаў і ярлыкоў для гомельскай трыкатажнай фабрыкі «8 Сакавіка» складае некалькі мільёнаў.

*20 снежня 1968 г.*

### І загамоняць хвоі

Сёлетняй вясной калектыў Мазырскага лясгаса паспяхова справіўся з лесапасадкамі. На былых пясчаных пустэчах плошчай 469 гектараў высаджаны сеянцы сасны.

*17 чэрвеня 1970 г.*

### Госці з Чэхаславакіі

Добрыя сяброўскія сувязі ўстаноўлены цяпер паміж СССР і ЧССР, і ў прыватнасці паміж працоўнымі Мазыршчыны і г. Страканіцэ Паўднёва-Чэшскай вобласці. Чэхаславацкія сябры прыязджаюць да нас, а прадстаўнікі Мазыра і раёна былі гасцямі Чэхаславакіі...

*4 ліпеня 1970 г.*

### Магутная ЦЭЦ на Мазыршчыне

Для нафтаперапрацоўчага комплекса, які ўзводзіцца на Мазыршчыне, спатрэбіцца вялікая колькасць цеплавой энергіі. Рашэннем урада Саюза ССР у раёне прамысловага комплекса намечана будаўніцтва буйной цеплавой электрастанцыі. Гэтая ж станцыя будзе забяспечваць цяплом і жылы масіў Мазыра, які ўзводзіцца ў раёне Баброў.

*27 лістапада 1970 г.*

### Даражаць славай бацькоў

Хлопцы з Мазыршчыны У. Грышчанка і В. Каханоўскі з гонарам выконваюць свой абавязак перад Радзімай у гвардзейскай часці, якая ў гады вайны прайшла слаўны баявы шлях. Бацька Уладзіміра Сяргей Мікалаевіч прымаў удзел у кровапралітных баях пад Старой Русай, у вызваленні Беларусі.

*15 красавіка 1971 г.*

### Помнік мужным патрыётам

У двары школы № 4 Мазыра ўзвышаецца манумент. Гэта помнік мужным патрыётам-падпольшчыкам горада, якія загінулі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1941—1943 гадах.

22 лютага з выпадку адкрыцця помніка тут адбыўся мітынг. Яго адкрыў старшыня Мазырскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных Рыгор Фядосавіч Ганчар. Затым на мітынгу выступілі старэйшы камуніст горада А. П. Эльман, удзельнік гераічнага падполля А. С. Мураўёў, былы народны мсціўца К. С. Гаруля, піянерважатая школы Н. К. Байдзюк.

*23 лютага 1972 г.*

### Воін, настаўнік, выхавацель

Звыш трыццаці гадоў настаўнікам Бокаўскай школы працуе Антон Пракопавіч Царэнка, жыхар вёскі Бокаў. Толькі вайна адрывала Антона Пракопавіча ад любімай справы. З вайны ён вярнуўся з трыма ордэнамі і некалькімі медалямі. Сотні навучэнцаў прайшлі перад настаўнікам за многія гады, атрымалі неабходныя веды, рыхтаваліся да ўступлення ў свядомае жыццё.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР 29 верасня 1972 г. А. П. Царэнку прысвоена ганаровае званне «Заслужаны настаўнік БССР».

*20 кастрычніка 1972 г.*

### Яго ведаюць у раёне

І. М. Букіш



Івана Міхайлавіча Букіша ведаюць у раёне як аднаго са старэйшых механізатараў калгаса імя Калініна. У гады першых пяцігодак стаў ён трактарыстам і вось ужо каля 40 гадоў вырошчвае хлеб. У гады вайны храбра змагаўся з ворагам. Сведчанне таму — ордэн Славы і некалькі баявых медалёў.

Пасля вайны ён зноў на трактары. Дапамагае таварышам па рабоце, навучае іх механізатарскаму майстэрству. Аўтарытэт Івана Міхайлавіча ў калгасе вялікі, а павага і падзяка за работу самі знаходзяць дастойных. Толькі за апошнія пяць гадоў І. М. Букіш удастоены ордэнаў Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга...

*20 чэрвеня 1977 г.*

* * *

На прыватным прадпрыемстве «Кентаўр Прамсервіс» ідуць апошнія работы па падрыхтоўцы да выпуску каўбасных вырабаў.

Абсталяванне закуплена ў Германіі...

У Мазыры працуюць прадпрыемствы камерцыйных структур па вытворчасці мэблі, швейных вырабаў і іншых тавараў.

Рыначная эканоміка становіцца ў горадзе рэальнай перспектывай і канкурэнтам дзяржаўных прадпрыемстваў.

*«Жыццё Палесся», 21 студзеня 1995 г.*

## Каб не згасла зорка...

Рэканструкцыя Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода дасць прыбаўку больш за мільён тон бензіну. Доля Мазырскага НПЗ у валавым прадукце рэспублікі складае каля 4 працэнтаў, што само па сабе сведчыць аб яго значэнні. А калі ўлічыць, што тут выпрабляецца прадукцыя стратэгічная для ўсёй эканомікі, то і праблемы прадпрыемства, несумненна, становяцца ў шэраг агульнадзяржаўных.

Ва ўмовах сусветных цэн на нафту яе перапрацоўка пры ўстарэлай тэхналогіі ўсё больш стратная. Толькі рэканструкцыя, якая дае дадатковы выхад высакаякасных светлых прадуктаў, дазволіць забяспечыць рэнтабельную работу завода. Таму прынята спецыяльная пастанова ўрада аб будаўніцтве ў Мазыры комплекса глыбокай перапрацоўкі нафты, а праект рэканструкцыі ўключаны ў лік прыярытэтных.

Са студзеня 1994 года завод стаў акцыянерным таварыствам, што таксама звязана з будучай рэканструкцыяй. Яе кошт складае 400 млн. долараў. Акцыяніраванне дазваляе прыцягнуць дадатковыя капіталы. Тым больш што курс акцый, якія маюць адносіны да нафты, пастаянна расце.

Вучоныя, спецыялісты, замежныя эксперты высока ацэньваюць перспектывы нафтаперапрацоўкі ў Мазыры. На прадпрыемстве склаўся кваліфікаваны калектыў, працуюць высакакласныя спецыялісты. За два дзесяцігоддзі сваёй гісторыі завод заявіў аб сабе унікальнымі дасягненнямі. Яшчэ зусім нядаўна НПЗ быў буйным пастаўшчыком рэактыўнага паліва для авіяцыі былога Саюза. Тут вырабляюць высокаактанавы бензін А-95 і экалагічна чыстае дызпаліва, у якім утрыманне серы — меней за 0,1 працэнта, што вышэй сучасных сусветных стандартаў. Прадукцыя завода адзначана Міжнароднай брыльянтавай зоркай якасці. У ліку пяці прадпрыемстваў СНГ ён з'яўляецца членам асацыяцыі нафтаперапрацоўшчыкаў ЗША.

Будаўніцтва ўстаноўкі каталітычнага крэкінга, а гэта — галоўная мэта рэканструкцыі, дазволіць давесці вытворчасць светлых нафтапрадуктаў да 79 працэнтаў (зараз — меней за 50).

Перспектыўнасць рэканструкцыі зацікавіла шэраг замежных фірм, у чым пераканаў міжнародны тэндэр, арганізаваны мазыранамі. У ім удзельнічала восем замежных кампаній. З пераможцамі — нарвежскай фірмай «Норынга» і італьянскай «Снампраджэці» — заключаны кантракты на дэтальную распрацоўку і здзяйсненне праекта. Праграма рэканструкцыі разлічана на 52 месяцы.

«Каб забяспечыць надзейнасць праекта рэканструкцыі, — гаворыць дырэктар завода Уладзімір Мікалаевіч Здабноў, — мы ідзем па шляху ўзмацнення звязкі «здабыча — перапрацоўка — збыт». Разам з двума расійскімі прадпрыемствамі, якія разведваюць і здабываюць нафту ў Цюменскім рэгіёне, ствараем холдзінгавую акцыянерную кампанію «Славнафта». Павялічваем і ўласны статутны фонд з наступным продажам акцый насельніцтву і юрыдычным асобам...»

Кіраўніцтва завода прыкладае энергічныя намаганні па рэалізацыі прыярытэтнага для рэспублікі праекта. Для ўстаноўкі паглыбленай перапрацоўкі нафты (па сутнасці гэта новы завод) ужо падрыхтавана пляцоўка.

*В. Логвін*

«Рэспубліка», 29 верасня 1994 г.

## Соль зямлі мазырскай

«Экстра. Соль Палесся» — так напісана на пачку солі, якую выпускае Мазырскі солевыварачны камбінат.

Расказваюць, як нехта са старажылаў горада, калі даведаўся, што ўсё жыццё мясцовы люд хадзіў па солі (а раней яна была на вагу золата), усклікнуў: «Гэта ж трэба, якая багатая наша зямля. Да рэвалюцыі ў пана жменькі не выпрасіш, а яе, аказваецца, тысячы тон пад нагамі, бяры — не выбераш...»

Так, вякамі залягала соль у нетрах мазырскага Палесся. Але даведаліся аб гэтым толькі ў XX стагоддзі. У XIX стагоддзі соль на Мазыршчыну дастаўлялі па Прыпяці з Краменчуга. А яшчэ раней — з Галіцыі, Прусіі. Цяжка перавозіць яе. Калі быў вецер, уверх па цячэнні Прыпяці судна плыло пад ветразямі. У спакойнае надвор'е яго гналі вёсламі.

З Пінска да Краменчуга судна ішло каля трох тыдняў. Там выменьвалі соль на жыта, дровы, клёпку, брусы, мёд.

Баркі ўмяшчальнасцю да 2000 пудоў і больш хадзілі з Прыпяці праз Агінскі канал да Шчары і Нёмана, а па Каралеўскім канале — да Мухаўца і Буга. Доўгім і цяжкім быў саляны шлях.

Сёння на солевыварачным камбінаце прымяняецца арыгінальная тэхналогія здабычы солі. Пасля бурэння свідравін іх пад вялікім ціскам запаўняюць вадой, якая насычаецца соллю да 35 працэнтаў. Атрыманы расол пад ціскам падымаецца на паверхню і па трубаправодах падаецца ў аддзяленне ачысткі, дзе з яго выдзяляюцца солі кальцыю і магнію. Пасля гэтага ачышчаны раствор паступае ў выпарныя агрэгаты і адтуль праз шэраг службаў дастаўляецца ў сушыльныя печы. Далей шлях солі пралягае ў цэх расфасоўкі.

Першыя вагоны з палескай соллю былі адпраўлены рыбакам Поўначы. З'явілася соль і на прылаўках мясцовых магазінаў. У 1985 годзе камбінат выдаў 193 тысячы тон солі. Праектная магутнасць — 360 тысяч тон.

Мазыране заўсёды рады сябрам, якія прыязджаюць з розных гарадоў. Асабліва дарагіх гасцей сустракаюць тут па старадаўнім звычаі — хлебам-соллю. Хлебам, які вырошчваюць на Палессі, і соллю, якую здабываюць у яго нетрах.

*Ю. Герасіменка*

## ПРАМЫСЛОВЫ МАЗЫР ВАСЬМІДЗЕСЯТЫХ

**Адзін дзень горада ў лічбах**

| № п/п | Паказчыкі | 1985 г. | 1986 г. | 1987 г. |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Вытворчасць таварнай прадукцыі (тыс. руб.) | 2823,7 | 3076 | 3220 |
| 2. | Удзельная вага ў аб'ёме прамысловасці вобласці (%) | 17,7 | 17,9 | 17,9 |
| | *Важнейшыя віды прамысловай прадукцыі* | | | |
| 1. | Электраэнергія (тыс. квт-гадзін) | 2502 | 2974 | 2944 |
| 2. | Кабельная прадукцыя (км) | 5614 | 6025 | 6096 |
| 3. | Меліярацыйныя машыны (тыс. руб.) | 228,3 | 238,2 | 249,5 |
| 4. | Кармавыя дрожджы (тон) | 238,3 | 428 | 643 |
| 5. | Соль (тон) | 528 | 728,3 | 913 |
| 6. | Швейныя вырабы (тыс. руб.) | 55,5 | 56,8 | 61,2 |
| 7. | Трыкатажныя вырабы (тыс. руб.) | 56,1 | 62,4 | 64,5 |
| 8. | Мэбля (тыс. руб.) | 108,4 | 111,3 | 121,7 |
| 9. | Перавозка пасажыраў аўтамабільным транспартам (тыс. чал.) | 135,4 | 139,5 | 147,7 |
| 10. | Перавозка грузаў аўтамабільным транспартам (тыс. тон) | 45,0 | 47,0 | 49 |
| 11. | Уведзена ў дзеянне жылой плошчы (кв. м) | 152 | 199,5 | 222,6 |
| 12. | Рознічны тавараабарот (тыс. руб.) | 282,5 | 291,2 | 315,6 |
| 13. | Жалезабетон (куб. м) | 713,0 | 742,0 | 760 |

*«Камуніст Палесся», 20 лістапада 1988 г.*

## Усё пачынаецца з праекта...

Часткай пейзажу нашага горада даўно стала вялікая колькасць вежавых кранаў. Там, дзе вецер гуляў з пяском ды падымаўся над зямлёй рэдкі хмызняк, выраслі новыя жылыя раёны сучасных пабудоў. А хто ж не ведае: вуліца, плошча горада ці пасёлка пачынаецца з праекта.

У Мазыры праектная арганізацыя была створана ў 1948 г., з 1966 г. — гэта Мазырскі архітэктурна-будаўнічы аддзел. У 1990 г. быў створаны Мазырскі філіял праектнага інстытута «Гомельграмадзянпраект», а ў чэрвені 1993 г. — праектны інстытут комплекснага праектавання — «Палессепраект».

Зараз у інстытуце працуюць чатыры архітэктурна-канструктарскія брыгады, сантэхнікі, электрыкі, дзве групы каштарысу, сектар інжынерных пошукаў, група афармлення і выпуску праектаў, машынапіснае і капіравальнае бюро, транспартная група. Вялікая ўвага ў інстытуце надаецца аўтаматызаванай сістэме праектавання. Створаны аддзел тэхнічнай інфармацыі і аўтарскага нагляду.

Асноўная мэта інстытута — комплекснае праектаванне аб'ектаў жыллёва-грамадзянскага і іншага прызначэння ў Мазыры, іншых гарадах і населеных пунктах Рэспублікі Беларусь. Інстытут удзельнічае ў рэалізацыі дзяржаўнай праграмы па пераадоленні вынікаў аварыі на ЧАЭС, выконвае комплексныя інжынерныя пошукі для капітальнага будаўніцтва і на аб'ектах, дзе праводзяцца дэзактывацыйныя работы.

Інстытут «Палессепраект» робіць праекты дэталёвай планіроўкі і забудоў жылых мікрараёнаў, электразабеспячэння і сувязі, газа- і цеплазабеспячэння, тэхніка-эканамічныя разлікі, тэхнічную дакументацыю жыллёвых, школьных і дашкольных, сацыяльна-культурных, бытавых, гандлёвых, лячэбна-прафілактычных і іншых грамадзянскіх забудоў у гарадах і сельскай мясцовасці.

Акрамя гэтага, інстытут выконвае праекты забудоў, пашырэння і тэхнічнага пераабсталявання прадпрыемстваў, дапамагае ім кансультацыяй і паслугамі ў праектаванні, будаўніцтве і ўвядзенні ў вытворчасць прагрэсіўных тэхналогій.



Абмеркаванне праекта будучай забудовы Мазыра

Дзякуючы творчай працы калектыва інстытута і будаўнічых арганізацый горад Мазыр, іншыя гарады і вёскі маладзеюць і прыгажэюць.

*Т. Пілінчук*

## Порт Мазыр раней і цяпер

На левым беразе Прыпяці раскінуўся порт Мазыр (да 1985 г. — порт Пхоў). Старажылы расказваюць, што тут, на пясчаных курганах, у далёкія дарэвалюцыйныя часы стаялі ўсяго два невялікія домікі, у якіх жылі вартаўнікі прымітыўнай прыстані Стралкоўскі і Лаўрэн. Але вось з чыгуначнай станцыі Калінкавічы ў пачатку гэтага стагоддзя на Пхоў была праведзена чыгуначная ветка. І невялічкая прыстань паступова пачала ажываць, разрастацца. Грузы дастаўляліся па Прыпяці з Екацярынаслава (зараз Днепрапятроўск), Краменчуга, Чаркас, Кіева і іншых гарадоў на драўляных баржах — ганчаках. На такіх суднах, якія належалі прыватным уладальнікам, працаваў старэйшы рачнік Прыпяці Афанасій Рыгоравіч Ус (ён узнагароджаны ордэнам Леніна). Сваю працоўную дзейнасць на водным транспарце ён пачаў яшчэ ў 1905 г. У 1916 г. на беразе затона была пабудавана эстакада для выгрузкі і складзіравання грузаў. У час першай сусветнай і грамадзянскай войн у Пхове сканцэнтравалася ваенная флатылія, маракі якой прымалі актыўны ўдзел ва ўстанаўленні Савецкай улады на Палессі.

У 1932 г. быў расчышчаны затон Пхова, пачалося будаўніцтва жылых дамоў. Па рацэ ў напрамках Мазыр — Кіеў, Мазыр — Тураў пачалі курсіраваць пасажырскія судны.

У 1935 г. на Прыпяці разгарнулася спаборніцтва за буксіроўку вялікагрузных плытоў. Рачнікі ў ліку першых у горадзе падтрымалі стаханаўскі рух. Праз год пачаўся і кругласутачны рух параходаў. Ініцыятарам такога прагрэсіўнага метаду выступіў капітан парахода «Парыжская камуна» П. М. Кебец. З кожным годам порт папаўняўся новым флотам, павялічваўся аб'ём грузаперавозак. Прыгажэйшым і багацейшым станавілася жыццё рачнікоў.

У першыя дні Вялікай Айчыннай вайны частка флоту адразу ж была перададзена ў распараджэнне Чырвонай Арміі, а частка была занята эвакуацыяй прамысловага абсталявання і насельніцтва Мазыра. За гады вайны ўся рачная гаспадарка, флот порта Пхоў былі знішчаны. Аднак рачнікі не палі духам і дружна ўзяліся за аднаўленне гаспадаркі. З дна Прыпяці былі падняты патопленыя параходы «Парыжская камуна», «Арктыка», «Рулявы», «Амур», «Матрос», «Урал» і іншыя. Гераічнай працай рачнікоў пры брацкай дапамозе народаў нашай краіны порт быў хутка адноўлены. Да 1950 г. рост грузаперавозак намнога павялічыўся. Па Прыпяці пайшлі грузы ў Польшчу, ГДР. Гэта былі ў асноўным каменны вугаль і жалезная руда.

У 1958 г. на месцы прыстані пачалося будаўніцтва буйнога рачнога порта, магутнасць якога з кожным годам узрастала. Так, калі адразу ў пасляваенныя гады перапрацоўка грузаў за год складала 70—75 тысяч тон, то цяпер яна складае каля 1 мільёна тон. На дапамогу людзям прыйшла магутная сучасная тэхніка — партальныя электрычныя краны, цеплаходы на дызельным паліве і іншыя механізмы і абсталяванне. Шырокае распаўсюджванне атрымаў новы метад суднаваджэння — штурханне суднаў. Прыкметна развіваецца пасажырскі флот. Па Прыпяці курсіруюць судны на падводных крылах...

*«Камуніст Палесся», 15 ліпеня 1967 г.*

#### Ад рэдактара-складальніка

Мінула 30 гадоў з моманту публікацыі артыкула. Не пазнаць порта Мазыр цяпер. Паявілася самая сучасная тэхніка. Перапрацоўка грузаў у 1991 г. склала 4,5 млн. тон. Побач з портам вырас новы мікраранён Зарэчны з усёй інфраструктурай. Тут жыве каля 10 тысяч жыхароў.

## Пяць мірных дзесяцігоддзяў

У апошнія гады, у сувязі з распадам Савецкага Саюза, роля порта Мазыр у перавозках і перапрацоўцы грузаў зменшылася ў некалькі разоў. У 1996 г. яны склалі паўмільёна тон. Амаль не стала і перавозак пасажыраў. Але збярогся калектыў, не парушана матэрыяльная база. Ёсць перспектыва — перавозка да Чорнага мора салігорскіх мінеральных тукаў і будаўнічых матэрыялаў. Порт будзе жыць і працаваць...

М. С. Бабарыкін



### Багацце наша — лес

Мазырскі лясгас, створаны ў 1962 годзе, вядомы сваімі поспехамі ў лесакультурнай справе. Праводзіцца вялікая работа па стварэнні ландшафтных культур на тэрасах Мазырскага ўзвышша, а насаджэнні вакол горада — гонар гаспадаркі. Адметны па сваім рэльефе і наборы раслiннасці заказнік Мазырскія кручы. Значная работа праводзіцца лясгасам па зберажэнні і ахове лесу ў прамысловай зоне, рэкультывацыі зямель, абсталяванні месцаў для адпачынку ў лясах. Для захавання рэдкай флоры і фауны створаны заказнік Зялёнамошскі. Лясгас выступіў ініцыятарам у справе рэканструкцыі дуброў і іх зберажэнні. У 1987 годзе створана лесанасенная плантацыя дуба чарэшчатага.

Тут ёсць гадавальнік плошчай 36 га, у якім штогод вырошчваецца каля 4 млн. сеянцаў. Выяўлены і ахоўваюцца рэдкія віды парод — элітная сасна, карэльская бяроза, бук заходні, лістоўніца сібірская, кедр, бархат амурскі. Закладзены плантацыі для прамысловай нарыхтоўкі ароніі, ці чарнаплоднай рабіны, абляпіхі, арэха грэцкага і фундука, шыпшыны, вярбы тэхнічнай.

У сярэднім за год нарыхтоўваецца каля 100 тысяч кубаметраў лесаматэрыялу. Частка дробнатаварнай драўніны ідзе на экспарт у Фінляндыю і Швецыю, што дае магчымасць купляць сучасную тэхніку і абсталяванне. Лясгас выпускае шырокі асартымент тавараў народнага карыстання. Дрэваапрацоўчы цэх у Слабадзе апрацоўвае каля 20 тыс. кубаметраў драўніны ў год.

У лясгасе працуюць шмат ветэранаў,



Маладыя пасадкі лесу на тэрасах мазырскіх узгоркаў

сапраўдных майстроў сваёй справы — леснікі Г. М. Буйнавец, В. С. Перапеча, Л. Д. Мельчанка, В. І. Кунцэвіч. З дня ўтварэння гаспадаркі пачаў сваю працоўную дзейнасць шафёр М. В. Пакацін. Лепшыя ляснічыя гаспадаркі — М. С. Вянгура, Г. С. Канопліч, Д. П. Кашэвіч, Г. П. Ганчароў. Творча кіруе лесаапрацоўчым цэхам А. П. Ліс. Ад бацькі — патомнага лесавода пераняў любоў да прыроды і М. Д. Дадзько, які прайшоў шлях ад майстра лесу да дырэктара лясгаса. Да яго на гэтай пасадзе за трыццаць гадоў змяніліся толькі два чалавекі: М. С. Бабарыкін і Р. Е. Бондар, якому прысвоена званне «Заслужаны лесавод Беларускай ССР».

*М. Капач*

### За тысячы міль ад Палесся

Гэта буйное акіянскае судна водазмяшчэннем 18 тысяч тон пабудавана ў 1966 годзе. Сотні рэйсаў здзейсніў за гэты час цеплаход «Мазыр», наведаў каля 100 партоў больш чым 30 краін свету. За кармой «Мазыра» — некалькі мільёнаў кіламетраў.

У першым жа рэйсе, калі «Мазыр» ішоў з Ленінграда на Кубу, экіпаж чакала сур'ёзнае выпрабаванне. Атлантыка сустрэла маракоў моцным штормам, а ў трумах стаялі экскаватары. Яны сарваліся са стопараў і сталі біцца аб борт. Некалькі гадзін змагаўся экіпаж з небяспекаю, пакуль не замацавалі машыны.

24 гады працаваў цеплаход без капітальнага рамонту, узнагароджаны Ганаровымі граматамі Чарнаморскага марскога параходства, Ганаровым дыпломам. У жніўні 1969 года «Мазыр» абгінаў паўднёвую частку Афрыкі, калі на судна абрушылася велізарная акіянская хваля, якая сарвала фальшбот паўбака, вентыляцыйныя трубы, выклікала іншыя пашкоджанні. Такое ж выпрабаванне выпала цеплаходу і ў 1974 годзе ў Біскайскім заліве, калі з-за перамяшчэння грузу ўзнік небяспечны крэн, і толькі самаадданыя дзеянні экіпажа вярнулі судна ў нармальнае становішча, і цеплаход не выйшаў з графіка руху. Экіпаж памятае і агнявыя рэйсы 1967—1969 гадоў у В'етнам, калі пад грукат бомб і свіст асколкаў маракі не спынялі разгрузку. «Мазыр» быў адным з першых савецкіх суднаў, якія ўвайшлі ў Хайфон пасля размініравання. Баразніць цеплаход акіянскія воды і цяпер...

*Т. Паліпчук*

## Імі ганарыцца Мазыршчына

### Героі Сацыялістычнай працы

**Галка Уладзімір Мікітавіч** (н. 13. 10.1923 г. ) — перадавік нафтаздабываючай прамысловасці.

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля заканчэння мінамётнай школы накіраваны на савецка-кітайскую граніцу (востраў Даманскі). У пачатку 1942 г. — курсант Чэлябінскага танкавага вучылішча, быў механікам-вадзіцелем танка. Удзельнічаў у баях пад Курскам, многіх іншых баявых аперацыях. Вайну закончыў у Чэхаславакіі, быў тройчы паранены.

З 1951 г. — дызеліст, буравы майстар Беларускай канторы разведачнага бурэння ў Мазыры, затым працаваў буравым майстрам Рэчыцкай нафтаразведачнай экспедыцыі глыбокага бурэння трэста «Беларусьнафтагазразведка». Званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена ў 1971 г. за паспяховае выкананне заданняў 8-га пяцігадовага плана.

Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Айчыннай вайны, Славы III ст., медалямі.